# “Песняр зямлі беларускай”




У 2022 годзе адзначаецца **140 год з дня нараджэння** беларускага пісьменніка **Якуба Коласа**.

Імя народнага паэта Беларусі Якуба Коласа – **Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч** – класіка беларускай літаратуры, добра вядома не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі. Яго творы перакладзены больш чым на сорак моў свету. Разам з Янкам Купалам ён стаяў каля вытокаў беларускай літаратурнай мовы, заклаў устойлівы грунт для развіцця сучаснай беларускай літаратуры.

Будучы паэт нарадзіўся **3 лістапада 1882 г**. ў засценку Акінчыцы былога Мінскага павета. Пасля заканчэння Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі працаваў настаўнікам на Палессі. За ўдзел у нелегельным настаўніцкім з’ездзе ў 1906 г. Якуб Колас быў асуджаны на тры гады. Пасля вызвалення 1912 г. выкладаў у Пінскім 3-м прыходскім вучылішчы. Летам 1913 г. Якуб ажаніўся з настаўніцай Марыяй Дзмітрыеўнай Каменскай.

У 1921 годзе Якуб Колас з сям’ёй пераехаў у Мінск, працаваў у розных установах асветы. У 1926 г. ён атрымаў званне Народнага паэта Беларусі. У 1928 г. стаў акадэмікам АН БССР, з 1929 – член яе Прэзідыума, а потым – віцэ-прэзідэнт.

Упершыню верш будучага паэта *“Наш родны край”* быў надрукаваны ў газеце “Наша доля” у 1906 г. за подпісам **“Якуб Колас”**. Канстанцін Міцкевіч выкарыстоўваў і другія псеўданімы, але толькі “Якуб Колас” застаўся з ім на ўсё жыццё. У 1910 г. у Вільні выйшаў яго першы паэтычны зборнік *“Песні-жальбы”*.

За творы ваенных гадоў – кнігі “Адпомсцім”, “Голас зямлі” – Якубу Коласу была прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР.




У 1949 годзе Якуб Колас атрымаў другую Дзяржаўную прэмію СССР за паэму *“Рыбакова хата”*. У 1954 г. ім была завершана заключная частка трылогіі *“На ростанях”*. Першыя дзве аповесці *“У палескай глушы”* і *“У глыбі Палесся”* былі напісаны яшчэ ў 20-я гады. Трылогія з’явілася не толькі самым значным творам пісьменніка, але адным з першых беларускіх раманаў.

Якуб Колас займаўся вершаванымі перакладамі на беларускую мову твораў А. Пушкіна, М. Лермантава, Т. Шаўчэнкі і іншых.

У творах Коласа знайшлі глыбокае мастацкае адлюстраванне жыццё беларускага народа на пераломных этапах гісторыі, барацьба народных масс за сацыяльнае разняволенне і нацыянальную роўнасць.

Якуб Колас - класік нацыянальнай літаратуры, стваральнік неўміручых паэтычных шэдэўраў *"Новая зямля"* і *"Сымон - музыка"*, адзін з заснавальнікаў беларускай мастацкай прозы, беларускага рамана, аўтарытэтны настаўнік некалькіх пакаленняў творчай моладзі, выдатны педагог, вучоны, арганізатар навукі, дзяржаўны і культурны дзеяч.




Яго заслуга ў тым, што ён расказаў свету пра беларускі край, пра мужны, свабодалюбівы, гераічны народ, выявіў у мастацкім слове яго сацыяльныя і нацыянальныя памкненні, невычэрпныя духоўныя магчымасці. Творы Якуба Коласа характарызуюцца шырынёй ахопу жыццёвых з’яў, тэматычнай разнастайнасцю, мастацкай дасканаласцю. Напісаныя сакавітай народнай мовай, яны вызначаюцца непаўторным нацыянальным каларытам, першароднай свежасцю. Пісьменнік узняў беларускае слова на ўзровень сталага мастацтва, паставіўшы яго побач з развітымі літаратурамі свету, і ў гэтым яго вялікая заслуга.



Імя народнага песняря з любоўю ўшаноўвае беларускі народ. У 1959 - 1965 г.г. прысуджалася Літаратурная, а з 1971 г. раз у два гады прысуджаецца Дзяржаўная прэмія імя Я. Коласа за лепшыя празаічныя творы і літаратуразнаўчыя працы. Яго імя

прысвоена Мінскаму паліграфічнаму камбінату, цеплаходу Дунайскага параходства, Інстытуту мовазнаўства АН Беларусі, Цэнтральнай навуковай бібліятэцы АН Беларусі, Віцебскаму драматычнаму тэатру, школам, бібліятэкам, калгасам, плошчам і вуліцам рэспублікі. Помнікі пісьменніку пастаўлены на плошчы Мінска, якая носіць яго імя, на радзіме ў вёсцы Мікалаеўшчына, а таксама ў г. Навагрудку Гродзенскай вобласці, в. Плоскае Талачынскага раёна Віцебскай вобласці. Устаноўлены мемарыяльныя дошкі на будынках, у якіх ён жыў ці працаваў.








У Мінску існуе Літаратурны музей Якуба Коласа, у Акінчыцах, Смольні, Альбуці і Ластоку - яго філіялы. А ў пакоі, дзе паэт працаваў як віцэ-прэзідэнт АН БССР, адноўлены мемарыяльны кабінет.



У бібліятэцы каледжа святкаванню 140-годдзя паэта нададзена асаблівая ўвага. З 1 па 7 лістапада арганізавана **тэматычная паліца «Песняр зямлі беларускай»**. На юбілейнай выставе, прысвечанай Якубу Коласу, прадстаўлены зборы твораў пісьменніка, асобна выдадзеныя творы, матэрыялы пра яго жыццё і творчасць.




**Запрашаем наведаць выставу!**